НЕ ЖАРТАМ, А ЎСУР'ЁЗ

# ХАЧУ Ў ПАРЫЖ!

*Каб сустрэцца з Таццянай Шыманскай, я мусіла дачакацца яе вяртання з першай «замежнай дыпламатычнай» камандзіроўкі — з вёскі Залужжа Старадарожскага раёна, дзе будучыя дыпламаты дапамагалі гаспадарцы ратаваць ураджай бульбы.*

Усяго на аддзяленні міжнародных адносін гістарычнага факультэта зараз навучаецца 85 чалавек. Сярод іх — чатыры дзяўчыны: тры першакурсніцы і Таццяна, адзіная сярод сваіх аднакурснікаў, вучыцца ўжо на другім.

Таццяна заўсёды імкнулася чым-небудзь здзіўляць свет і калі запыталіся ў яе яшчэ ў шостым класе, кім яна марыць быць, адказала: «Буду дыпламатам!» З таго часу яе так і ўспрымалі, як будучую дыпламатку, але толькі жартаўліва. І, здаецца, нечакана нават для самой Таццяны гэтыя прыемныя дзіцячыя жартачкі ажыццявіліся.

Палітыка і жанчына. Дыпламатыя на дзяржаўным узроўні — сур'ёзная справа. Адказная. І толькі мужчынская? Пра гэта можна доўга спрачацца. Вось толькі ўрывак з падобнай спрэчкі, у якую я паспрабавала ўцягнуць аднакурснікаў Таццяны. На калідоры. Перад заняткамі.

— Прафесія гэта не выключна мужчынская...

— А мне здаецца якраз наадварот.

— Ды што вы, жанчына ў дыпламатыі? Не су-р'ёз-на!

— Але кожнае правіла мае выключэнне...

— Не, усё ж гэта нават вар'яцтва нейкае — давяраць важныя дзяржаўныя пытанні жанчыне. Яна ж падуласна пачуццям...

— А мужчына?

— А мужчына заўсёды кантралюе свае паводзіны.

— А жаночая інтуіцыя?

— Ёй не месца ў вялікай палітыцы.

— Але дзеля розных поглядаў чаму б жанчыне не быць у дыпламатыі?

— Вось, да прыкладу, сакратар-рэферэнт. У якасці сакратара яшчэ можна ўспрымаць жанчыну, але ў якасці дыпламатычнага супрацоўніка... Вельмі шмат адказных рашэнняў трэба на сябе браць. А сямейны бюджэт? Хто у асноўным вырашае? Мужчына.

— Жанчына.

— Жанчыне давяраць грошы?..

— Колькі я ведаю сем'яў, і толькі ў адной з іх сямейным бюджэтам распараджаецца муж.

— І правільна робіць...

— Вось будзе ў вас сям'я, спадар стараста, я пагляджу, як вы будзеце распраджацца фінансамі... Будзеце прыносіць жонцы дадому заправалту ў 30 тысяч...

— А вы?

— А я? Наогул не буду прыносіць яе дадому.

— Ён будзе рабіць сваёй жонцы каштоўныя падарункі.

І наогул, калі жанчына жадае паўдзельнічаць у вялікай палітыцы, няхай зробіцца жонкай дыпламата.

— А вы б жадалі, каб ваша жонка займалася палітыкай?

— Палітыкай? Мая жонка? Не, што вы!

Размову працягвае Валерый Міхайлавіч Пісараў, выкладчык навейшай гісторыі краін Еўропы і Амерыкі:

— Давяраць жанчыне ў дыпламатыі можна. Заходняя дыпламатыя дала нам цудоўныя прыклады: прэм'ер-міністр Канады, Нарвегіі. І ў нас — тая ж Старавойтава. Жанчына па сваёй прыродзе павінна быць дыпламатам. Канешне, давяраць аднаму чалавеку лёс краіны нельга. Жанчына павінна ў дыпламатыі і палітыцы быць не адна. А ў асяроддзі мужчын яна сваё месца знойдзе, і з поспехам.

А для Таццяны Шыманскай галоўнае зараз — здабыць як мага больш ведаў. Да Францыі яшчэ далёка, і ўсё пра яе толькі «жартачкі» — ад французскай мовы, якую Таццяна ўжо няблага ведае, да першай курсавой па знешняй палітыцы Францыі. Але ўсё можа здарыцца.

Таццяна КАЗАК.

ПЕДСАВЕТ

# «Я Б У НАСТАЎНІКІ ПАЙШОЎ»

*«1 верасня. Першы ўрок, першае знаёмства з дзевятым класам... 2 верасня. На пачатку кожнага ўрока знаходжу на крэсле кнопкі. Правяраюць. Даўняя традыцыя жыве і квітнее. Але нічога, будзе чым карты да дошкі прыціскаць... 3 верасня. У шостым класе паставіў першыя ў сваёй рабоце «пяцёрку» і «двойку»... (з дзённіка настаўніка).*

З Ігарам (для многіх ужо Аляксандравічам) Валахановічам пазнаёміўся пяць год таму, калі той паступіў на гістарычны факультэт універсітэта. Гады вучобы праляцелі вельмі хутка і ўчарашні студэнт сёння ўжо настаўнічае на перыферыі, з'яўляецца класным кіраўніком 9 класа. Пасля заканчэння універсітэта была ў яго магчымасць застацца ў Мінску, знайсці больш прэстыжны варыянт працаўладкавання. Стоячы перад няпростым выбарам, ён аддаў перавагу школе. Якраз з гэтага пытання і пачалася наша гутарка:

— Разумееце, я і сабе не магу даць адназначны адказ, чаму пайшоў працаваць у школу. Некаторыя выпускнікі як агню баяцца размеркавання ў школу. Чаму? Чым школа іх так пужае? Ажно цікавасць бярэ. Ужо другі месяц я настаўнічаю і не знаходжу ў гэтай працы нічога дрэннага.

**— Якія праблемы паўстаюць на шляху маладога настаўніка, і як ты іх вырашаеш?**

— Іх хапала. Пачынаючаму настаўніку трэба знайсці, перш за ўсё, паразуменне з дырэктарам і калегамі па працы. А яшчэ трэба заваяваць аўтарытэт у школьнікаў. Апошняе рэалізаваць больш складана. Сам яшчэ не так даўно скончыў школу і таму не паспеў забыцца на адносіны вучняў да «неабстраляных» настаўнікаў, асабліва калі тыя па прычыне сваёй нявопытнасці ідуць часам на паваду ў класа. І каб падобнага не здаралася, трэба з імі быць у меру прынцыповым і строгім. Дзеля гэтага ў адносінах з вучнямі я прытрымліваюся некаторых правілаў. Па-першае, калі я перакананы ў аб'ектыўнасці пастаўленай адзнакі, а вучань спрабуе яе аспрэчваць, ні ў якім разе не мяняю свайго рашэння. Па-другое, ніколі не затойваць на вучняў злобу, што б тыя не зрабілі: дзеці ёсць дзеці. І, па-трэцяе, патрабую дакладнага і своечасовага выканання сваіх даручэнняў. Калі напачатку вучні не надта сур'ёзна ставіліся да маёй патрабавальнасці, то зараз іх думкі на гэты конт змяніліся.

**— Ці ёсць у цябе жаданне нешта змяніць у школьнай «кухні»?**

— Школа — гэта сістэма з двума палюсамі. На адным вучні, на другім — настаўнікі. Паміж імі—вялікая прастора. Так, вучням не ўсё падабаецца ў школьнай сістэме, нешта ім хацелася б змяніць. Але пры гэтым яны мала ведаюць, як ты сказаў, школьную «кухню». Знешне здаецца, што настаўнік цалкам свабодны ў сваёй прафесіі. Але гэтая свабода — усвядомленая неабходнасць. Настаўнік мае перад сабою праграму, метадычныя патрабаванні, вялікі клас, сорак пяць хвілін уроку, час, за які трэба паспець і апытаць вучняў, і расказаць ім новую тэму, і запоўніць класны журнал. Эксперыментаваць з усім гэтым цяжка і ці патрэбна ўвогуле?

**— Ды і прадмет, зазначым, дастаўся табе не з лёгкіх...**

— Наўрад ці магчыма ўсё пералічыць. У гэтым годзе ідзе пераход ад старой праграмы да новай. Як вынік, многія класы маюць непамерна вялікі аб'ём матэрыяла па гісторыі для вывучэння. На што раней адводзіўся год альбо паўтара, зараз выкладаецца за паўгода. І каб паспець усе расказаць, трэба ставіць гісторыю ў класе на 4 — 5 разоў на тыдзень, прычым кожны раз даваць па дзве-тры тэмы. Нагрузка непамерная нават для студэнта.

Альбо ўзяць сітуацыю з падручнікамі. Па некаторых дысцыплінах іх няма. Ёсць, да прыкладу, «Дапаможнік па гісторыі Беларусі (для 5 — 6 класаў)», які для школы зусім не падыходзіць. Адзін тэкст, многа дат і прозвішчаў, адсутнасць малюнкаў, схем і многага іншага. Напісаны ён навукоўцамі, якія добра ведаюць гісторыю, але не маюць ніякага дачынення да школы. Што казаць, калі вышэйназваны дапаможнік для пятага класа можа быць выкарыстаны студэнтамі першага курса гістарычнага факультэта.

Разам з тым, нарэшце, размежавалі гісторыю Беларусі і Расіі. Калі мы жывем зараз у незалежнай дзяржаве, то павінны больш увагі надаваць сваёй гісторыі.

**— Ігар, а сваёй адукацыяй ты задаволены?**

— Плюс універсітэцкай падрыхтоўкі ў паглыбленым вывучэнні самой гісторыі. Мінус — у досыць павярхоўным знаёмстве з методыкай школьнага выкладання і псіхалогіяй. Аднак мінус хутка знікае пасля некалькіх месяцаў працы ў школе, а плюс застаецца назаўсёды.

Аляксандр ЮРЫН.

# ЯК ДАПАМАГЧЫ САБЕ ПРЫ ХВАРАВІТЫМ СТАНЕ?

СЛУЖБА 03

Згадзіцеся, гэта здараецца нярэдка. Быццам бы і тэмпература нармальная і ўрач не знаходзіць падстаў для хвалявання аб стане вашага здароўя, а стомленасць не дае актыўна працаваць. Што рабіць? Часова перапыніць працу, якая выклікала стомленасць, прыняць цёплую ванну ці зрабіць нажную ванну хвілін на дзесяць, а часам дастаткова проста пасядзець ці трохі паляжаць, высока падняўшы ногі, або выпіць шклянку гарбаты з малаком ці мёдам.

У мэтах прафілактыкі стомленасці трэба правільна чаргаваць усякую дзейнасць з адпачынкам. Добра дапамагаюць наступныя сродкі:

— кожную раніцу абціracца халоднай вадой;

— пры інтэнсіўнай разумовай працы абавязкова перад сном рабіць нажную гарачую ванну на 10 хвілін;

— па меры магчымасці не забывацца на ўжыванне агародніны, садавіны, арэхаў, рыбы.

Ёсць і яшчэ адзін цудадзейны сродак ад упадку сіл. Нацёртую на цёрцы рэдзьку есці некалькі разоў на дзень, запіваючы сталовай лыжкай вады.

### Галаўныя болі

Яны бываюць featureрознага характару. Прычынай іх могуць стаць акуляры, якія не падыходзяць. Тады дастаткова іх змяніць і болі знікнуць.

Між іншым, кожнаму з нас неабходна ведаць паказчыкі свайго крывянога ціску. Тады можна будзе да сустрэчы з урачом пры павышаным ціску пакласці гарчычнік на патыліцу, а пры паніжаным выпіць гарачай гарбаты ці кавы. Добра патрымаць валідол пад языком для сняцця спазмаў сасудаў.

Мігрэнь — бывае ад няправільнага кровазвароту, ад дрэннай работы страўніка. Хвароба часта пачынаецца з таго, што вочы засцілаюцца туманам, здараецца, у кагосьці цямнее ў вачах, у іншых — вочы слязяцца.

Асабліва часта мігрэнь паяўляецца пасля хваробы, калі арганізм недастаткова адужаў. Яна можа быць і спадчыннай. Вылячыць гэту хваробу вельмі цяжка, але паспрабаваць палепшыць самаадчуванне можна.

Часам боль знімаецца прыкладваннем да скроні лімоннай коркі. Калі ў час галаўнога болю адна палавіна галавы робіцца чырвонай, на гэты бок трэба класці халодныя прымочкі, а ногі апускаць у гарачую ваду. Карысна таксама ўсю галаву абвязваць гарачым ручніком ці некалькі хвілін пасядзець пад звычайным фенам.

Бяссонніца. Яе выклікаюць розныя прычыны. Часцей за ўсё яна суправаджае людзей, якія маюць няўстойлівую нервовую сістэму, лёгка ўзбуджаюцца. У такім выпадку трэба пазбягаць па вечарах разумовай працы, любой актыўнай дзейнасці, прагляду перадач па тэлевізары, асабліва дэтэктываў і фільмаў жахаў.

Карысна прыкласці грэлку да ног ці апрануць шарсцяныя наскі.

Калі казаць аб народных сродках, дык гэта выпіванне на ноч шклянкі гарачай салодкай вады, гарачага малака ці вады з мёдам, альбо гарачага настою валер'янавага кораню.

Пры бяссонніцы ад фізічнай стомленасці дастаткова прыняць цёплую нажную ванну. Пры разумовай стомленасці прымаюць прахладныя ванны альбо душ. Калі гэта не дапамагае, рэкамендуецца пашыць бялізну з цёплай тканіны, афарбаваць спальню ў цёмны тон, добра заштораваць вокны. Зразумела, калі бяссонніца мучыць вас на працягу доўгага часу, неабходна звярнуцца да ўрача.

Н. КРАСІЛЬНІКАВА,
урач.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

# НАДРУКАВАНЫЯ ЎПЕРШЫНЮ

*У Мінску адкрылася выстаўка слоўнікаў, якія выйшлі ў рэспубліцы за апошнія сем дзесяцігоддзяў. Экспазіцыя арганізавана сумеснымі намаганнямі Міністэрства інфармацыі і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, з фондаў якіх і ўзята большасць экспанатаў старых выданняў. «Маладое» пакаленне слоўнікаў прадстаўлена прадукцыяй цяперашніх дзяржаўных і камерцыйных структур. Сярод іх пакуль не было чарговага выдання незалежнай выдавецкай кампаніі «Тэхналогія»—«Ангельска-Беларускага» і «Беларуска-Ангельскага» слоўнікаў вядомага дзеяча нашай эміграцыі з ЗША Яна Пятроўскага.*

*Наш карэспандэнт сустрэўся з прэзідэнтам НВК «Тэхналогія» Вацлавам БАГГДАНОВІЧАМ.*

**— Ці нельга больш падрабязна расказаць аб дзейнасці вашай яшчэ юнай кампаніі?**

— Нашы чытачы, а значыць і нашы сябры, якія ўважліва сочаць за дзейнасцю выдавецтва, ведаюць, што вось ужо больш года мы выдаем і распаўсюджваем на Беларусі і за яе межамі фактычна адзіны англамоўны часопіс аб нашай рэспубліцы «Беларускі агляд», газету эміграцыі «Беларус». За кароткі час выдавецтва выдала ў свет так неабходныя зараз слоўнікі — «Расейска-беларускі вайсковы», «Расейска-беларускі хімічны», «Расейска-беларускі фізіялагічны», грунтоўную рэлігійную працу на роднай мове «Будслаў — сьвятыня Беларусі», першую кнігу таленавітага беларускага паэта і барда Анатоля Кудласевіча «Плакун-трава».

**— І вось слоўнікі Пятроўскага, пра якога мы, на жаль, ведаем вельмі мала.**

— Дарма. Пісьменнік, навуковец Ян Пятроўскі нарадзіўся і вырас у Слуцку, пасля вядомых гістарычных завірух дзвюх сусветных войнаў «пагасціў» у Нямеччыне, Аўстрыі, а зараз ужо доўгі час жыве ў ЗША, у штаце Фларыда. У свае амаль 90 год з'яўляецца дзейсным і актыўным Прэзідэнтам адукацыйна-харытатыўнага фонду Яна і Аліцыі Пятроўскіх. Галоўная мэта фонду — інфармаванне свету аб Беларусі, спрыянне развіццю беларускай мовы і культуры, пашырэнню нацыянальнага друкаванага слова. Ян Пятроўскі — аўтар «Клясічнага грэцка-беларускага слоўніка», укладальнік шырокавядомага двухтомніка «Лепшыя думкі чалавека», перакладчык на родную мову «Выбраных дыялогаў» Платона, «Універсальнай Дэкларацыі правоў чалавека« і цэлага шэрагу іншых кніг. Слоўнікі Пятроўскага, па водгуках спецыялістаў з Інстытута замежных моў, па свайму зместу ўнікальныя. Яны налічваюць звыш 10 тысяч тэрмінаў, прычым беларуская частка падаецца «тарашкевіцай».

**— Гэта зразумела, што слоўнікі будуць карысныя ўсім, хто вывучае ангельскую мову, навукоўцам, студэнтам, філолагам, жыхарам англамоўных краін, якія бяруцца за вывучэнне беларускай мовы, але не менш важна і тое, што на Беларусь вяртаецца велізарны навуковы, культурны і этнаграфічны пласт нашай гісторыі, які ўтрымлівае ў сабе адзінае слова—«эміграцыя»...**

—...менавіта таму, каб чытачы адчулі і дух, і трагічнасць, і шчасце той страшэнна цяжкай эпохі, мы максімальна імкнуліся захоўваць мову арыгінала.

Ян Пятроўскі выдаў свае слоўнікі ў 1946 годзе ў Аўстрыі. На Беларусі ж яны, як, дарэчы, і ўсе пералічаныя вышэй выданні нашай выдавецкай кампаніі, друкуюцца ўпершыню і вельмі абмежаваны накладам — усяго 2 тысячы асобнікаў. Папярэдні кошт двух слоўнікаў, выдадзеных у адной кнізе — 1.500 рублёў (кошт канца лістапада, калі выданне ўбачыць свет).

Даведацца больш дакладна аб умовах распаўсюджвання слоўнікаў можна па тэлефоне 21-77-40.

М. МІКАЛАЕВА.

ПАПЯРЭДЖАННЕ

# Будзьце пільнымі!

***У сувязі з павелічэннем крадзяжоў з кватэр і службовых кабінетаў праваахоўныя органы папярэджваюць: ва ўмовах дэфіцыту і высокіх цэнаў злачынцы не грэбуюць нічым.***

Міліцыя рэкамендуе:

— Не пакідайце нават на вельмі кароткі час кабінет адчыненым;

— не дапускайце выпадкаў пакідання ключэй у замках дзвярэй кабінетаў на любы час;

— выходзячы з кабінета, вялікія сумы грошай і каштоўнасці кладзіце ў сейф ці забірайце з сабой;

— не перадавайце ключы ад службовых памяшканняў невядомым грамадзянам;

выключыце выпадкі пакідання ключэй ад кватэры на стале ці ў плашчах і пінжаках, пакінутых вамі ў кабінеце. Заўсёды насіце іх з сабой;

— разам з калегамі па рабоце высвятляйце асобу грамадзян, якія ходзяць па калідоры і зазіраюць у кабінеты.

**Э. ПЕТРАШЭЎСКІ,
намеснік начальніка
аддзялення аховы
грамадскага парадку
і прафілактыкі
Маскоўскага РАУС
г. Мінска.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав...
Мінская паліграфічная ...
«Чырвоная зорка» М...
імя Я. Коласа.

14 кастрычніка
Зак. 1709.
Т. [illegible] экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.

Газета падпісана ў друк 15.10.93 у 16.00